Падтрымай "Вясну" на PATREON

Штрафы не прымусяць спыніць збор подпісаў за бел-чырвона-белы сцяг

09.10.2016 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Алесь Макаеў і Зміцер Захарэвіч 28 верасня ў пераходзе на станцыі метро “Інстытут культуры”. Фота: svaboda.org

Актывісты Зміцер Захарэвіч і Алесь Макаеў, аштрафаваныя за “паўторнае парушэнне парадка правядзення масавых мерапрыемстваў”, намераны і надалей удзельнічаць у кампаніі за наданне бел-чырвона-беламу сцягу статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Адміністратыўная справа **Алеся Макаева** і **Змітра Захарэвіча**, якія 28 верасня збіралі подпісы за прызнанне бел-чырвона-белага сцяга гісторыка-культурнай каштоўнасцю, разглядалася ў судзе Кастрычніцкага раёна Мінска 6 кастрычніка. Адпаведны пратакол на актывістаў быў складзены наўпрост падчас збору подпісаў у пераходзе на станцыі метро “Інстытут культуры”. Супрацоўнікі міліцыі Кастрычніцкага раёна - маёр **Колб**, які складаў пратакол, а таксама **Лаўрыновіч** і **Якуновіч**, якія здымалі іх на відэа - выступілі сведкамі ў судзе супраць актывістаў.

Як паведаміў ПЦ “Вясна” Зміцер Захарэвіч, суддзя **Віталь Сямёнаў** у выніку разгляду справы прызнаў актывістаў вінаватымі ў паўторным парушэнні парадку правядзення масавых мерапрыемстваў (ч. 3 арт. 23.34 КаАП) і пакараў штрафамі: Алесю Макаеву – 50, а Змітру Захарэвічу - 30 базавых велічынь.


> *“Вялікія памеры штрафаў тлумачацца тым, што судзілі нас паводле часткі 3 артыкула 23.34, што прадугледжвае паўторнае правапарушэнне. Мне далі меншы штраф – відаць, верш спадабаўся”,* - зазначае Зміцер Захарэвіч, чый зачытаны ў судзе верш працытавала “Свабода”.

Нагадаем, што 29 верасня судовыя выканаўцы вынеслі маёмасць са здымнай кватэры сям’і Алеся Макаева дзеля пагашэння неаплачаных ім штрафаў за папярэднія акцыі.


Нягледзячы на тое, што адміністратыўны пераслед абодва актывісты лічаць несправядлівым і незаконным, абскарджваць штрафы яны не збіраюцца, паколькі не маюць спадзеваў на тое, што рашэнне суда вышэйшай інстанцыі будзе справядлівым.

Твитнуть










Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023





АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі трэмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе ААН пра Беларусь?

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY